Чаус С.Э., студ. гр. 550 ФІДК
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Бамбешка І.І.,
ст. выкладчык

# ЗАХАВАННЕ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ У МУЗЕЯХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У цяперашні час у Беларусі музычныя інструменты захоўваюцца ў шматлікіх музеях розных профіляў: літаратурных (Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча “Кушляны”, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы і яго філіял “Вязынка”), этнаграфічных (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту), краязнаўчых (Барысаўскі дзяржаўны аб’яднаны музей), ваенна- (Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны) і агульнагістарычных (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) [6, с. 80, 86, 100, 303–307, 335–337].

Сярод беларускіх музяў, у якіх музычныя інструменты вылучаны ў асобную калекцыю, можна ўзгадаць Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў, Бярозаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Добрушскі раённы краязнаўчы музей, Івянецкі музей традыцыйнай культуры, Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, Мотальскі музей народнай творчасці, Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей і інш. [6, с. 100, 111–115, 157–160, 245–248, 267–270, 314–317, 397–400].

Адзіным музеем у Беларусі, у якім збіральніцтва музычных інструментаў абумоўлена яго профілем, з’яўляецца Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь. У ім, аднак, сабрана невялікая колькасць музычных інструментаў – менш за 100 адзінак захавання. Музычныя інструменты вылучаны ў асобную калекцыю, у якую ўваходзяць прафесійныя і народныя інструменты [10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калекцыя пачала фарміравацца ў 1990 г. і асноўная колькасць прадметаў была сабрана за першыя 5 год. У 1994 г. калекцыя налічвала ўжо больш за 60 адзінак захавання. Яна папаўнялася за кошт падарункаў і закупак у майстроў і прыватных асоб. Важнай крыніцай з'яўляліся аўкцыёны. Разам з тым, музей не праводзіў экспедыцый, гэтым тлумачыцца невялікая колькасць аўтэнтычных народных інструментаў у калекцыі [5, с. 41; 10].

У нашай краіне сярод музеяў найбольшай калекцыяй музычных інструментаў (амаль 300 адзінак захавання асноўнага фонду) валодае Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

Доўгі час разам з музычнымі інструментамі ў калекцыю ўваходзілі фонадакументы, музычныя прылады, аўдыёвізуальныя апараты і гадзіннікі. У 2009 г. музычныя інструменты былі вылучаны ў асобную калекцыю [11].

Калекцыя музычных інструментаў пачала фарміравацца з 1957 г., гэта значыць з моманту заснавання Дзяржаўнага музея БССР. Падчас этнаграфічных экспедыцый па Беларусі былі выяўлены і трапілі ў збор музея традыцыйныя беларускія музычныя інструменты канца XIX — пачатку XX ст. Некаторыя інструменты былі набыты ў прыватных асоб, этнографаў-даследчыкаў, калекцыянераў [7, с. 4].

Паводле інвентарных кніг, у 1990 г. калекцыя музычных інструментаў налічвала ўжо 143 адзінкі захавання. Іх колькасць працягвала павялічвацца і ў наступныя гады: у 1992 г. налічвалася 178 адзінак захавання, у 1998 г. – 224 адзінкі захавання, у 2002 г. – 244 адзінкі захавання, у 2006 г. – 269 адзінак захавання [11].

Сёння калекцыя музычных інструментаў складаецца з традыцыйных народных інструментаў мінуўшчыны, з работ сучасных майстроў-аматараў і майстроў-прафесіяналаў, а таксама вырабаў фабрык музычных інструментаў.

Сярод абласных краязнаўчых музеяў найбольш значнай калекцыяй музычных інструментаў валодае Мінскі абласны краязнаўчы музей (горад Маладзечна). У калекцыі "Музычныя інструменты" дадзенай установы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

налічваецца 42 адзінкі захавання. Прадстаўлены струнныя шчыпковыя (цымбалы, гітара керамічная і інш.), смыкавыя (скрыпка, колавая ліра і інш.), клавішныя (піяніна кабінетнае), духавыя язычковыя (розныя жалейкі, акардэон, гармонік, баян), свістковыя (акарына, "дудка беларуская драўляная" і інш.), самагучальныя (кастаньеты) музычныя інструменты. Калекцыя пачала фарміравацца ўжо ў 1960-х гадах (музей у горадзе Маладзечна заснаваны 31 ліпеня 1959 г.). Музейнымі супрацоўнікамі ладзіліся экспедыцыі ў вёскі Мінскай вобласці, адбываліся закупкі ў мясцовых жыхароў, майстроў і музыкаў, таксама ў музей трапляла прадукцыя беларускіх заводаў, у тым ліку мясцовай фабрыкі музычных інструментаў "Маладзечна" [2; 3].

Вялікая колькасць музычных інструментаў захоўваецца ў раённых краязнаўчых музеях. Сярод гэтых прадметаў трапляюцца сапраўды ўнікальныя рэчы. Так, у Лепельскім раённым краязнаўчым музеі захоўваецца адзін з самых цікавых музычных інструментаў Музейнага Фонда Рэспублікі Беларусь – дуда, узрост якой перавышае 130 год. Гэта самы стары інструмент падобнага тыпу, які захаваўся на Беларусі. Дуда была перададзена ў музей жыхаром вёскі Верабкі І.Д. Міснікам. Трэба адзначыць, што нягледзечы на сваю ўнікальнасць, вялікую інфарматыўнасць, навуковую і эстэтычную каштоўнасць, гэты інструмент не аднесены да пэўнай музейнай калекцыі (нават да этнаграфічнай) і заінвентарызаваны пад нумарам агульнай калекцыі "Рэчы" [12].

Асобна калекцыя музычных інструментаў вылучана ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Асноўную частку рэчавых помнікаў дадзенай установы складаюць мемарыяльныя рэчы дзеячаў літаратуры і мастацтва. Сярод музычных інструментаў – цытра, якая належала вядомаму беларускаму кампазітару В. Яфімаву, дырыжорская палачка дырыжора і кампазітара М. Шнейдэрмана, піяніна заслужанага артыста Беларусі В. Скарабагатава і інш. [14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавая калекцыя народных інструментаў захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры ДНУ "ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі". Яна была сабрана інструментазнаўцам І.Д. Назінай [9, с. 103].

Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выклікае пастаянная выстава Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" "Музыка вячорак", дзе прадстаўлены музычныя інструменты, перададзеныя музею кіраўніком фальклорнага гурта "Ліцьвіны" У.Х. Берберавым [1].

У 1982 г. пры Мінскім інстытуце культуры (зараз Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў) была створана майстэрня па вырабу беларускіх народных інструментаў, якую ўзначаліў заслужаны дзеяч мастацтваў У. Я. Пузыня. Дзейнасць па вытворчасці і збіранні музычных інструментаў працягнуў выкладчык універсітэта У.М. Гром, намаганнямі якога ва ўстанове была створана пастаянная выстава музычных інструментаў [9, с. 101].

Такім чынам, музычныя інструменты захоўваюцца ў шматлікіх беларускіх музеях у і складаюць даволі значную частку Музейнага Фонду Рэспублікі Беларусь. У большасці выпадкаў музеі ўтрымліваюць народныя музычныя інструменты, якія часта з'яўляюцца часткай этнаграфічных калекцый. Аднак, склад калекцый музычных інструментаў некаторых музеяў адрозніваецца. Так, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўвае музычныя інструменты, якія належалі партызанам у гады апошняй вайны; у экспазіцыі "Сталовая ізба" замкавага комплекса "Мір" паказаны рэканструяваныя музычныя інструменты эпохі Рэнесансу і ранняга барока [13].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" прапануе выставу "Музыка вячорак" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.tvr.by/bel/culture.asp?id=9362. – Дата доступу : 26.07.2009.

2. История музея // Минский областной краеведческий музей города Молодечно [Электронны рэсурс]. – 2008–2009. – Рэжым доступу : http://www.mokm.actmol.by/. – Дата доступу : 26.02.2011.

3. Кніга паступленняў прадметаў асноўнага фонду // Мінскі абласны краязнаўчы музей.

4. Кніга паступленняў прадметаў асноўнага фонду // Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

5. Лабовіч, А. Першая экспазіцыя Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры / А. Лабовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 3. – С. 41.

6. Музеі Беларусі: даведачнае выданне / рэд. Г.П. Пашкоў, Л.В. Календа, М.Г. Нікіцін. – Мінск, 2008. – 560 с.

7. Музычныя інструменты: Струнныя: музейны каталог / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі; [Г.М.Загурская]. – Мінск : Выдавец В.П. Анікеенка, 2000. – 15 с.

8. Протокол фондово-закупочной комиссии Государственного музея БССР от 24.11.1973 г. // Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь

9. Скорабагатчанка, А.В. Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя / А.В. Скорабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 397 с.

10. Спіс калекцыі музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры // Бягучы архіў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

11. Спіс калекцыі музычных інструментаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь // Бягучы архіў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

12. Стельмах, А.В. Из истории музея / А.В. Стельмах // Лепельский районный краеведческий музей [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

доступу : http://www.museum.lepel.by/history2.php. – Дата доступу : 26.07.2009.

13. Тэматыка-экспазіцыйны план экспазіцыі “Сталовая Ізба” у Замкавым комплексе “Мір” // Бягучы архіў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

14. Шырокава, Т. БДАМЛіМ – скарбніца нацыянальнай літаратуры і мастацтва / Т. Шырокава // Архівы Беларусі [Электронны рэсурс]. – 2006–2011. – Рэжым доступу : http://archives.gov.by/index.php?id=299237. – Дата доступу : 26.07.2009.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ